юнісэф
для кожнага дзіцяці

ПРЫ ФІНАНСАВАЙ ПАДТРЫМЦЫ ЎРАДА РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ

А. С. Іванцэвіч



# ГАНАРУСЯ РОДНАЙ МОВАЙ: РАЗВІВАЕМ МОВУ, ПАМЯЦЬ, МЫСЛЕННЕ

## РАБОЧЫ СШЫТАК

Вучэбнае электроннае выданне

МІНСК
Акадэмія адукацыі
2025

УДК 811.161.3(075.2)-056.313
ББК 74.3

А ў т а р
*А. С. Іванцэвіч*, настаўнік пачатковых класаў, настаўнік-дэфектолаг першай катэгорыі ДУА «Кемелішская сярэдняя школа» Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці

Дапаможнік падрыхтаваны ў рамках выканання праекта Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у Рэспубліцы Беларусь «Інклюзіўная адукацыя: спрыяльнае асяроддзе для рэалізацыі патэнцыялу кожнага дзіцяці»

Рэдактар *Т. У. Прымачонак*
Камп'ютарная вёрстка *А. М. Брыкет*

Падпісана да выкарыстання 2025
Размешчана на сайце 2025

Аб'ём выдання 6 888 КБ
Сістэмныя патрабаванні: ПЗ для прагляду дакументаў у фармаце pdf

Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Акадэмія адукацыі».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/573 ад 22.02.2024.
Вул. Някрасава, 20, 220040, г. Мінск

**ISBN 978-985-33-0151-9**

© Іванцэвіч А. С., 2025
© Афармленне. ДУА «Акадэмія адукацыі», 2025



# РЭКАМЕНДАЦЫІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

**Прызначэнне дыдактычных матэрыялаў:** на карэкцыйных занятках «Развіццё пазнавальнай дзейнасці» з выкарыстаннем матэрыялаў па вучэбных прадметах «Беларуская мова», «Літаратурнае чытанне» для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні.

**Месца дыдактычных матэрыялаў у адукацыйным працэсе:** магчыма выкарыстанне на ўроках па вучэбных прадметах «Беларуская мова», «Літаратурнае чытанне».

**Узрост:** 1—4 класы (у залежнасці ад індывідуальных пазнавальных магчымасцей вучняў).

**Кароткі метадычны каментарый:**

- *мэта выкарыстання дыдактычнага матэрыялу на карэкцыйных занятках:* развіццё пазнавальнай дзейнасці вучняў сродкамі беларускай мовы і літаратуры;
- *задачы выкарыстання дыдактычнага матэрыялу на карэкцыйных занятках:* развіццё сенсорна-перцэпцыйнай сферы, увагі і памяці, мыслення і ўяўлення, моўнай адчувальнасці, развіццё слоўнікавага запасу.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні:** з групай дзяцей або індывідуальна з бацькамі.

**Практычныя матэрыялы:**


1. Практыкаванні, накіраваныя на развіццё сенсорна-перцэпцыйнай сферы ........ 4
2. Практыкаванні, накіраваныя на развіццё ўвагі і памяці ........ 24
3. Практыкаванні, накіраваныя на развіццё мыслення і ўяўлення ........ 39

# 1. ПРАКТЫКАВАННІ, НАКІРАВАНЫЯ НА РАЗВІЦЦЁ СЕНСОРНА-ПЕРЦЭПЦЫЙНАЙ СФЕРЫ

**1.** Паслухай і запомні.

Дзяржаўны сцяг уключае ў сябе тры паласы: верхнюю — чырвонага колеру, ніжнюю — зялёнага, вертыкальную — арнамент на белым фоне. Арнамент — упрыгожанне, якое складаецца з геаметрычных фігур.

- Вазьмі аловак чырвонана колеру і зафарбуй верхнюю частку сцяга.
- Вазьмі аловак зялёнага колеру і зафарбуй ніжнюю частку сцяга.



- Уважліва разгледзь Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь. Адкажы вусна на пытанні:

Колькі частак мае сцяг? Пералічы гэтыя часткі.
З якіх колераў складаецца Дзяржаўны сцяг?
Які колер пераважае?

- Прачытай дома, што такое арнамент і заўтра раскажы сваім сябрам.

**2.** Пакажы жэстамі дзеянні людей.

падмесці падлогу

выцерці рукі

адкрыць кран

есці лыжкай

прычэсваць валасы

мыць насоўку

пачысціць зубы

**3.** Прачытай сказы. Якія словы называюць дзеянні прадметаў? Падкрэслі словы — назвы дзеянняў дзвюма рыскамі.

Узор. *Каты* (ш т о р о б я ц ь?) *мяўкаюць*.

Каты (ш т о р о б я ц ь?) мяўкаюць.
Сабака (ш т о р о б і ц ь?) брэша.
Камары (ш т о р о б я ц ь?) звіняць.
Курыца (ш т о р о б і ц ь?) кудахча.

**4.** Прачытай верш. Падкрэслі словы — назвы дзеянняў. Злучы кожную частку верша з адпаведным малюнкам. Апішы ластаўку (якіх яна колераў, памера), палічы малых птушанят.





Ластаўка-касатка
Лепіць сабе хатку.

Не хатку — гняздзечка.
Знясе ў ім яечкі.

З яек за лета
Выведзе дзетак.

*Ніна Галіноўская*



**5.** Прачытай і адкажы на пытанні. Змяні словы па ўзоры і запішы іх замест кропак. Раскажы, што ты рабіў (рабіла) учора, што будзеш рабіць заўтра.

| Сёння | Учора | Заўтра |
|---|---|---|
| ш т о р а б л ю? | ш т о р а б і ў? | ш т о б у д у р а б і ц ь? |
| *Я пішу.* | *Я пісаў.* | *Я буду пісаць.* |
| Я мыю. | … | … |
| Я чытаю. | … | … |

**6.** Прачытай верш. Вывучы першыя два радкі на памяць. Раскажы дома маме.

### Маме

Калі б магла вясёлку з неба зняць,
Я падарыла б маме.
Каб з хмарак я магла дыван саткаць,
Я падарыла б маме!
Пралескі ўсіх лясоў і стужкі рэк
Я падарыла б маме.
І ласку, і цяпло на доўгі век
Я падарыла б маме!

*Эдзі Агняцвет*

- Падпішы малюнкі, выкарыстоўваючы словы з верша.







**7.** Прачытай словы. У левы слупок запішы словы, якія абазначаюць вучобу, у правы слупок — словы, якія абазначаюць адпачынак. Раскажы пра свае любімыя занягкі.

Чытае, загарае, плавае, рашае, піша, гуляе, ляжыць, лічыць, вучыць, частуе, святкуе, працуе.

**8.** Разгледзь малюнкі. Раскажы, што робяць дзеці. Прыдумай імёны дзецям і запішы іх.


______________________


______________________


______________________


______________________

Словы для выкарыстання: *піша, малюе, лепіць, палівае.*

**9.** Прачытай словы. У кожным радку знайдзі лішняе слова. Растлумач, чаму яно не падыходзіць. Закрэслі яго. З кожнага радка выберы адно дзеянне і выканай яго.

Ідзе, крочыць, варыць, бяжыць, маршыруе.
Глядзіць, пазірае, мые, наглядае, сочыць.
Лепіць, садзіць, шые, гуляе, прыбірае.
Піша, чытае, спіць, малюе.

**10.** Прачытай вершы. Вусна пастаў да выдзеленых слоў пытанні. Вывучы адзін з вершаў на памяць на занятках. Якое ты ведаеш маміна свята?

**Мой падарунак**

На маміна свята
ўрачыста **скажу** я:
так **буду вучыцца,**
як мама **працуе.**

*Уладзімір Андрыевіч*

**Маміны рукі**

Слава маміным рукам,
што работу **любяць**
і **прыносяць** сонца нам,
ласкаю **галубяць.**

*Міхась Пазнякоў*

**11.** Прачытай словы. Растлумач значэнне кожнага слова. Пакажы кожнае дзеянне.

Ісці, выйсці, перайсці, прыйсці, пайсці, прайсці.

**12.** Прачытай верш. Вывучы яго на памяць на занятках. Раскажы яго ў пары (адзін называе дзень тыдня, а другі гаворыць, што робіць).

У панядзелак я спяваў.
У аўторак танцаваў.
У сераду ў басейн хадзіў.
У чацвер я верш вучыў.
У пятніцу ў футбол гуляў.
У суботу маляваў.
У нядзелю адпачываў.

*Таццяна Шылько*

• Запішы сказы пра панядзелак, чацвер, суботу. Падкрэслі словы — назвы дзеянняў.

**13.** Прачытай верш. Вывучы выдзеленыя радкі на памяць на занятках. Раскажы вывучаныя радкі настаўніку, паказваючы дзеянні.

Мае ручкі — чараўніцы.
Мае ручкі — працаўніцы.
**Ручкі кубачак памылі,**
**ручкі лялек накармілі.**
**Ручкі кветкі палілі**
**і падлогу падмялі.**
Потым леглі на падушку
да мяне пад вушка.

*Таццяна Шылько*

• Запішы трэці сказ. Падкрэслі дзвюма рыскам словы — назвы дзеянняў.

**14.** Прачытай. Параўнай словы — назвы дзеянняў у двух вершах. Спачатку назаві словы — назвы дзеянняў аднаго чалавека. Затым назаві словы — назвы дзеянняў некалькіх чалавек.

Я бягу, бягу, бягу,
я на месцы не стаю.
Я гуляю, загараю,
і суніцы я збіраю.

Мы бяжым, бяжым, бяжым,
мы на месцы не стаім.
Мы гуляем, загараем,
і суніцы мы збіраем.

- Падпішы ўсе дзеянні, выкарыстоўваючы словы з вершаў.






Я __________ Мы __________ Мы ____________ Я ____________

**15.** Прачытай. Якая пара года апісваецца ў вершы? Выпішы назвы птушак. Алоўкам чырвонага колеру падкрэслі пералётных птушак. Чаму яны называюцца пералётнымі?

Сонца грэе, прыпякае.
Лёд на рэчцы затрашчаў.
Цёплы вецер навявае,
хмар дажджлівых нам прыгнаў.
Вось і бусел паказаўся,
гусі дзікія гудуць.
Шпак на дубе расспяваўся,
жураўлі ўжо лятуць.

*Якуб Колас*



______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

- Абвядзі алоўкам зялёнага колеру птушку, якая з'яўляецца сімвалам Беларусі.

**16.** Прачытай. Падкрэслі назвы прадметаў адной рыскай, а назвы дзеянняў — дзвюма. Якая пара года апісваецца ў тэксце? Выберы малюнкі, якія адпавядаюць тэксту і вусна апішы адзін з іх (якая пара года адлюстравана на малюнку, чым займаюцца дзеці).

Узор. *Яшчэ снег ляжыць на зямлі.*

Яшчэ снег ляжыць на зямлі. Скора прыгрэе сонца. Пабягуць ручайкі. Дзеці зробяць шпакоўні. Прыляцяць птушкі. Прыйдзе вясна.






**17.** Разгледзь малюнкі. Назаві ўсе прадметы, геаметрычныя формы. Вызнач, якія прадметы па форме. Параўнай іх з геаметрычнымі формамі. Правядзі стрэлкі.



Словы для выкарыстання: *квадратная, трохвугольная, круглы; кола, мяч, кубік, падушка, елка, каробка, яблык, пірамідка.*

**18.** Прачытай сказы. Запішы адказы на пытанні.

Лімон жоўты і кіслы. Які лімон? ________________________

________________________________________________________

Рака блакітная і глыбокая. Якая рака? __________________

________________________________________________________

Мама добрая і ласкавая. Якая мама? ____________________

________________________________________________________

Дні цёплыя і сонечныя. Якія дні? _______________________

________________________________________________________

**19.** Прачытай. Разгледзь малюнкі. Па прыметах назаві прадметы. Запішы іх.

Круглы, смачны, сакавіты ________________.



Прадаўгаваты, жоўты, кіслы ______________.



Густое, каласістае, спелае ________________.



**20.** Прачытай назвы прымет. Падбяры пары слоў з блізкім значэннем. Злучы стрэлкамі.

| | |
|---|---|
| моцны | храбры |
| смелы | гучны |
| звонкі | магутны |
| вялікі | буйны |

**21.** Прачытай. Калі жадаюць добрага здароўя? Прыдумай і запішы шосты сказ.

Марына захварэла. Зазвінеў мабільны тэлефон. Марына пачула знаёмы голас. Сяброўка паведаміла пра дамашняе заданне. Яна пажадала добрага здароўя.

________________________________________________________

________________________________________________________

**22.** Прачытай словы. Вызнач, з якога матэрыялу зроблены прадметы. Адкажы на пытанні. Запішы сказы.

Запомні словы ***слоік, ручнік.***

Узор. *Слоік* (я к і?) *шкляны.*

Слоік (я к і?) ______________________.
Крэсла (я к о е?) ______________________.
Міска (я к а я?) ______________________.
Ручнік (я к і?) ______________________.
Дом (я к і?) ______________________.

| |
|---|
| драўлянае |
| шкляны |
| палатняны |
| гліняная |
| цагляны |

**23.** Назаві прадметы па прыметах. Запішы іх.

Запомні: ***прасціна — простыня.***

Халодны, моцны, пранізлівы ______________________.
Глыбокае, сіняе, шырокае ______________________.
Белая, гладкая, чыстая ______________________.
Доўгія, зялёныя, смачныя ______________________.

Словы для выкарыстання: *агуркі, вецер, мора, прасціна.*

• Прыдумай і запішы па адным сказе з двума словамі для выкарыстання (на выбар).

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

**24.** Прачытай вершы. Знайдзі ў вершах словы, якія адказваюць на пытанні я к а я? я к у ю? Раскажы пра сваю Радзіму. Што ты ведаеш пра сваю малую радзіму?

**Радзіма**

Радзіма ў нас цудоўная,
багаццяў розных поўная,
Радзіма ў нас лагодная,
нібы матуля родная.

*Артур Вольскі*

## Беларусам я радзіўся

Беларусам я радзіўся,
беларусам буду жыць,
беларускую зямельку
буду шчыра я любіць.
*Алесь Мілюць*

- Як называецца родная зямля?

**25.** Разгледзь малюнкі. Пакажы, дзе які твар (шчаслівы, сумны, злосны, спалоханы).






- Вазьмі люстэрка і паглядзі ў яго. Паспрабуй перадаць на сваім твары розны настрой.
- Адкажы на пытанні:

Калі ты радуешся?
Калі ты злуешся?
Калі ты здзіўляешся?
Калі ты палохаешся?

**26.** Разгледзь яблык, грушу, сліву, апельсін. Апішы адзін з гэтых пладоў (той, што больш табе падабаецца). Які ён па велічыні, форме, колеры? Які навобмацак, на смак, пах?






Узор. *Гэта яблык. Ён вялікі, круглы, чырвоны. Яблык цвёрды, смачны, духмяны.*

**27.** Разгледзь малюнкі. Прачытай назвы відаў спорту, спартсменаў і апісанне іх дзеянняў. Запомні віды спорту, распаўсюджаныя ў Беларусі, раскажы пра іх сваім таварышам. Злучы лініямі выявы спартсменаў з іх дзеяннямі.

Біятлон. Біятланіст бяжыць на лыжах, страляе ў мішэнь з вінтоўкі.

Грэбля. Байдарачнік плавае на байдарцы.

Бокс. Баксёр займаецца боксам.

Фігурнае катанне. Фігурыст катаецца на каньках.

Футбол. Футбаліст гуляе ў футбол.

Фрыстайл. Фрыстайліст выконвае скачкі на лыжах.

Хакей. Хакеіст гуляе ў хакей.

Плаванне. Плывец плавае.

Тэніс. Тэнісіст гуляе ў тэніс.











- Раскажы пра свой любімы від спорту.

**28.** Адкажы на пытанні.

Які сёння дзень тыдня?
Які зараз месяц?
Якая пара года?
Якія ты ведаеш веснавыя, летнія, зімнія, восеньскія месяцы?

**29.** Прачытай пытанні і закончы сказы.

Як тваё прозвішча? Маё прозвішча … .
Як цябе завуць? Мяне завуць … .
Як завуць тваю настаўніцу? Маю настаўніцу завуць … .

**30.** Прачытай верш. Вымаві сказы з правільнай інтанацыяй.

— *(Не)*адхопіш новай двойкі?
— *(Не)*пачнеш у школе бойкі?
— *(Не)*уцячэш з урокаў спеваў?
— *(Не)*палезеш больш на дрэва?
— *(Не)*напішаш на сцяне? —
Стась на ўсё адказваў:
— Не!

*Алесь Бачыла*

• Прыдумай загаловак да верша. Запішы яго. Спішы верш, раскрываючы дужкі.

**31.** Назва якога часопіса зашыфравана ў прыведзенай зорцы? Запішы яе.






**32.** Прачытай тэкст, устаўляючы патрэбныя літары ў канчаткі. Закрый тэкст рукой. Перакажы яго.

## Вавёрка

Жвава і спрытна пераскоквае вавёрк.. з дрэва на дрэва. Вось яна села на сук. І раптам яна шпарка спускаецца па ствал.. . Пад сасн.. яна знаходзіць крамяны грыб. І зноў вавёрка на сасн.. . І вось ужо рыжанькае футра мільгае на другім дрэв.. .

**33.** Прачытай верш. Вывучы першыя два радкі на памяць на занятках. Раскажы заўтра іх сябрам з класа.

## Па сасонцы скок ды скок

Па сасонцы скок ды скок
скача жвавенькі звярок.
Пад сасну кладу арэх:
— Злазь, вавёрачка, на снег!
Апусціўся ўніз звярок,
хоп арэх — і на сучок.

*Ніна Галіноўская*

- Злучы словы з іх прыметамі.



| | |
|---|---|
| зубы | пушысты, доўгі |
| вочы | учэпістыя, загнутыя |
| хвост | вострыя, моцныя |
| кіпцюры | чорныя, цікаўныя |

**34.** Выберы мянушкі сабак (зафарбуй кружок алоўкам чырвонага колеру).

Запомні: мянушкі сабак пішуцца з вялікай літары.

- ○ Шарык
- ○ шарык
- ○ рыжык
- ○ Рыжык
- ○ Жучок
- ○ жучок

**35.** Дапішы неабходныя літары ў пустыя клеткі. Прачытай словы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| к | а | з | а |
| | | с | |
| | | р | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| к | а | з | а |
| л | | | |
| в | | | |

**36.** Прачытай словы. Падкрэслі словы, якія нельга пераносіць.

Запомні: словы ***слон, зубр, воўк, дзік, гук, Мінск, Сож, акунь, алень*** пераносіць нельга.

Памылкі, слон, акунь, каза, зубр, бусел, воўк, дзік, гук, вожык, заяц, Мінск, Сож, алень, мора, бульба.

**37.** Злучы словы так, каб атрымаліся сказы. Запішы іх.

| | | |
|---|---|---|
| Дзяўчынка | дзяўбе | на заводзе. |
| Дзяцел | жыве | дзьмухавец. |
| Тата | знайшла | дрэва. |
| Шчупак | працуе | ў вадзе. |

**38.** Прачытай словы. Падзялі словы для пераносу вертыкальнай рыскай.

Сшытак, возера, качкі, трава, кніжка, вясна, людзі, кошка, казкі, раніца, восень.

- Складзі сказы з двума словамі і запішы іх.

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

**39.** Прачытай спалучэнні літар. Знайдзі гэтыя спалучэнні ў словах і падкрэслі іх.

***ГА*** ***ГУ*** ***ГО***

Гаварыць, агуркі, гутарка, агарод, галава, гукі, газета, прыгожы.

Узор. *Гаварыць, ...*

**40.** Разгледзь малюнкі. З дапамогай малюнкаў знайдзі назоўнікі па іх прыметах. Запішы спалучэнні слоў.

снежная, марозная, працяглая ____________________

роўныя, беласнежныя, здаровыя ____________________

густое, каласістае, налітае, спелае ____________________

стройная, вечназялёная, калючая ____________________

старэнькі, ласкавы, добры ____________________







**41.** Прачытай. Падкрэслі словы — назвы школьных прылад.

**Запомні, як пішуцца словы *сшытак, паштоўка, крэйда.***

Сшытак, паштоўка, гумка, крэйда, капялюш, аловак, ручка, падручнік, мёд.

**42.** Размалюй алоўкам чырвонага колеру кругі со словамі, якія адказваюць на пытанне к т о?, а зялёнага — кругі са словамі, якія адказваюць на пытанне ш т о?

мёд, зубр, ружа, каза, заяц, бусел, лес, пчала, кавун

**43.** Дапішы літары (Б, У, С, Е, Л). Прачытай верш.



☐услянка на дрэве.
☐ёй — бусляняты.
☐таміліся, дрэмлюць сабе.
☐жу бацькі ім шукаюць.
☐уг абышлі па чарзе.

*Валянціна Сцяпурка*

**44.** Адкажы пісьмова на пытанні.

Цукар які? ______________________________
Хлеб які? ______________________________
Агурок які? ______________________________
Прас які? ______________________________
Лёд які? ______________________________
Мячык які? ______________________________

Словы для выкарыстання: *круглы, салёны, салодкі, мяккі, гарачы, халодны.*

**45.** Прачытай подпісы пад малюнкамі. Абвядзі алоўкам чырвонага колеру першыя літары. Падкрэслі імя па бацьку.



Алена
Іванаўна



Ігар
Пятровіч



Уладзімір
Мікалаевіч



Ірына
Пятроўна



Леанід
Сяргеевіч



Марыя
Сцяпанаўна

- Назаві прафесіі гэтых людзей.

**46.** Прачытай. Злучы імёны дзяцей і дарослых.

| Імя дзіцяці | Імя дарослага |
|---|---|
| Таня | Сяргей |
| Сярожа | Таццяна |
| Алёша | Мікалай |
| Валя | Аляксандр |
| Саша | Валянціна |
| Міколка | Аляксей |

**47.** Прачытай імёны. Падкрэслі літары, якімі адрозніваюцца словы.

Маня — Таня
Жэня — Рэня
Даша — Маша
Зіна — Ліна
Валя — Галя
Толя — Поля
Ірачка — Іначка
Колечка — Волечка

**48.** Прачытай. Падкрэслі спачатку імёны дзяўчынак (алоўкам чырвонага колеру), а потым імёны хлопчыкаў (алоўкам зялёнага колеру).

Надзя, Зіна, Рая, Міколка, Дзяніс, Тамара, Валера, Святлана, Валодзя.

- Абвядзі алоўкам сіняга колеру першую літару.

**49.** Запішы ланцужок імён. Кожнае наступнае імя пачынаецца з апошняй літары папярэдняга. Падкрэслі вялікую літару ў імёнах.

Узор. *Кірыл — Ліда — Артур — … .*

Кірыл, Раман, Марына, Аркадзь, Ліда, Ніна, Артур, Арцём, Аліна, Дзіна, Акім, Міхаіл.

**50.** Запішы назвы жывёл у алфавітным парадку. Якія гэта жывёлы: дзікія ці свойскія (хатнія)? Дзе яны жывуць?

Ліса, ваверка, лось, рысь, дзік, мядзведзь.



- Апішы жывёлу на малюнку (знешні выгляд, памер, дзе жыве, чым харчуецца).

**51.** Прачытай словы. Зафарбуй алоўкам чырвонага колеру літары, якія абазначаюць галосныя гукі.

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| К | Л | У | Б | Н | І | Ц | Ы |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| М | А | Л | І | Н | Ы |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Ж | У | Р | А | В | І | Н | Ы |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Б | Р | У | С | Н | І | Ц | Ы |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| С | У | Н | І | Ц | Ы |

- Падпішы малюнкі. Запомні назвы ягад.







__________ __________ __________ __________ __________

**52.** Прачытай словы. Знайдзі лішняе слова ў кожным радзе. Падзялі гэтае слова для пераносу.

Яйкі, мяса, сподак, мука.
Крумкач, жораў, індык, кулік.
Люты, лета, ліпень, студзень.

**53.** Скажы, як называецца наша краіна. Запішы яе назву на карце.



**54.** Прачытай верш. Падкрэслі алоўкам зялёнага колеру назвы дрэў, чырвонага колеру — імёны дзяцей. Вывучы на памяць першыя чатыры радкі. Заўтра раскажы іх настаўніку і сваім сябрам у класе.

Мы ля школьнае дарогі
Ў гонар свята Перамогі
Ў вясновую нядзелю
Садзім новую алею.
Хто — бярозку,
Хто — рабінку,
Хто — таполю,
Хто — вярбінку,
Таня — ліпку,
Клім — дубок,
Ясь — каштан,
А я — клянок.
А Святлана і Наташа
Паліваюць дрэўцы нашы.
Хай расце і зелянее
Наша слаўная алея!

*Міхась Пазнякоў*

- Адкажы на пытанні:

У гонар якога свята дзеці садзілі дрэвы?
Калі святкуюць Дзень Перамогі?

**55.** Дапішы ў сказ патрэбнае слова. Вывучы на занятках сказ на памяць. Раскажы сваім аднакласнікам.



______________________________
______________________________ — сімвал Беларусі.

**56.** Злучы словы з адпаведнымі малюнкамі.

| настаўніца | вучаніца | вучань |
|---|---|---|





## 2. ПРАКТЫКАВАННІ, НАКІРАВАНЫЯ НА РАЗВІЦЦЁ ЎВАГІ І ПАМЯЦІ

**1.** Запішы «суседзяў» літары ў алфавіце. Раскажы беларускі алфавіт.

| | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | н | | | | г | | | | о | | | | ы | |

**2.** Прачытай сказы. Перастаў месцамі сказы, каб атрымаўся звязны тэкст. Запішы яго.

Ён з ахвотаю паказваў Ірачцы чырвоныя яблыкі, жоўтыя грушы. Дзед Ігнат любіў восеньскім ранкам зайсці ў сад.

________________________________________

________________________________________

________________________________________

• Якую яшчэ садавіну, акрамя яблыка і грушы, ты ведаеш? Якія стравы можна прыгатаваць з садавіны?

**3.** Устаў раздзяляльны мяккі знак або апостраф замест кропак. Раскажы, як ты адпачываеш са сваёй сям'ёй. Як завуць тваю настаўніцу?

У мяне вел..мі дружная сям..я. Мы разам працуем і адпачываем.

Сёння дрэннае надвор..е. З чорных хмар л..е халодны дождж.

Летняй раніцай вераб..і любяць купацца ў лужынах, а потым чысціць сваё пер..е.

Рабочыя рамантавалі дарогу, таму мы паехалі ў аб..езд.

Нашага настаўніка музыкі завуць Іл..я Васіл..евіч.

Дар..я Анатол..еўна вучыць нас прыгожа маляваць.

**4.** Выпішы словы з апострафам. Падкрэслі назвы птушак.

Сяўба, сям'я, пойдзем, б'е, бег, вераб'і, салаўіны, пад'ём, п'е, з'ехаў, кап'ё.

________________________________________

________________________________________

________________________________________

• Раскажы, як трэба дапамагаць птушкам зімой.

**5.** Дапоўні сказы патрэбнымі словамі. Устаў прапушчаныя літары замест кропак.

Запомні: ***паштальён*** — гэта чалавек, які разносіць пошту: газеты, часопісы, лісты.

Дождж моцна ________________ па даху.

Дрэннае ________________ трымала дзяцей у хаце.

Уся ________________ глядзіць перадачу па тэлевізары.

Сёння па радыё перадавалі ______________ для школьнікаў.

________________ Ул..яна Анатол..еўна вывучыла з намі гімн Рэспублікі Беларусь.

Словы для выкарыстання: *п..есу, б..е, сям..я, надвор..е, паштал..ён.*

**6.** Прачытай тэкст. Падкрэслі літару ***ч***. Пра каго расказваецца ў тэксце? Зайчык і вожык — гэта свойскія або дзікія жывёлы? Якіх яшчэ дзікіх жывёл ты ведаеш? Раскажы правілы паводзін пры сустрэчы з дзікімі жывёламі.

Аднойчы ўбачыў зайчык, як пад кустом вожык плача. Слёзы коцяцца ў беднага з вачэй. Зайчык пытаецца:

— Сябра вожык, чаго ты плачаш? Глянь, як сонейка свеціць *(Янка Галубовіч)*.

**7.** Прачытай. Адкажы на пытанні. Запішы адказы.

Як завуць тваю маму?

Маю маму завуць ________________________________________.

Як завуць твайго тату?

Майго тату завуць ________________________________________.

- Раскажы, як завуць тваіх дзядуль і бабуль.

**8.** Прачытай. Дапоўні сказы мянушкамі жывёл. Злучы стрэлкамі. У цябе ёсць свойскія (хатнія) жывёлы? Раскажы пра іх.

| | |
|---|---|
| Каля будкі ляжыць сабака → | Шарык. |
| На лузе пасецца конь | Пушок. |
| Бабуля доіць карову | Вецярок. |
| Мышэй ловіць кот | Чарнуху. |
| Куранят водзіць курыца | Чубатка. |

**9.** Прачытай сказы. Перастаў сказы так, каб атрымаўся звязны тэкст. Адшукай словы з гукам [дж], падкрэслі іх.

Але джаліць яна толькі тады, калі адчувае небяспеку. Пчала — вельмі цікавае насякомае. Жывуць пчолы ў вуллях. У яе ёсць добры памочнік — джала.

Туды яны носяць нектар. Там і хаваюцца ад дажджу.

**10.** Знайдзі словы, якія схаваліся ў імёнах. Запішы словы парамі.

Узор. *Света — свет, ...*

Света, Мікола, Соня, Барыс, Віялета, Уладзімір, Людміла.

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

• Назаві сваё імя. Запішы яго.

______________________________________________

**11.** Назаві і запішы імёны трох вучняў твайго класа, назвы двух гарадоў, дзве мянушкі свойскіх (хатніх) жывёл.

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

**12.** Прачытай словы. Выпішы словы з гукамі [дз’] і [дж] у два слупкі.

Запомні словы ***ураджай, агароджа.***

Прастудзіўся, цяпер, сняжынкі, ураджай, пасажыры, дзень, агароджа, шчупак, дзівак, вожык, дажджы, дружба.

| [дз’] | [дж] |
|---|---|
| ______________________ | ______________________ |
| ______________________ | ______________________ |
| ______________________ | ______________________ |
| ______________________ | ______________________ |

**13.** Прачытай. Змяні сказы па ўзоры.

Узор. *Хлопчыкі* (ш т о р а б і л і?) *насілі ваду.*
*Хлопчык* (ш т о р а б і ў?) *насіў ваду.*

Дзяўчынкі (ш т о р а б і л і?) збіралі суніцы.
Дзяўчынка ______________________________________.
Кветкі (ш т о з р а б і л і?) расцвілі.
Кветка ______________________________________.
Яблыкі (ш т о з р а б і л і?) паспелі.
Яблык ______________________________________.

Словы для выкарыстання: *паспеў, збірала, расцвіла.*

**14.** Прачытай словы. Злучы стрэлкамі прадметы і іх колеры.

Запомні: ***васілёк*** — кветка, сімвал Беларусі.

| | |
|---|---|
| сіні | возера |
| сіняе | васілёк |
| зялёны | трава |
| зялёная | лес |
| чорная | вясёлка |
| рознакаляровая | зямля |

**15.** Прачытай. Дапоўні сказы словамі — назвамі прымет прадметаў. Запішы іх.

### Вясна

Надышла вясна. Грэе … сонейка. На дрэвах — … лісточкі. Птушкі вярнуліся з … краёў. Салаўі спяваюць … песні. Усё прачнулася ад … сну.

Словы для выкарыстання: *зімовага, зялёныя, прыгожыя, далёкіх, цёплае.*

**16.** Падбяры назвы прымет да назваў прадметаў. Злучы стрэлкамі. Запішы ў дужках пытанні  я к і?  я к а я?  я к о е?  я к і я?

| | |
|---|---|
| вада ( ________ ) | магутныя |
| лес ( ________ ) | вузенькая |
| сцежка ( ________ ) | густы |
| дрэвы ( ________ ) | празрыстая |

• Запішы назвы дрэў, якія растуць у Беларусі.

**17.** З дадзеных слоў складзі сказы. Запішы іх.

Пасля, прачнуўся, мядзведзь, зімы.

З, ён, вылез, бярлогі.

Мядзведзь, вельмі, худы, быў.

Сонейку, рады, ён.

• Прачытай тэкст, які атрымаўся. Пра каго расказваецца ў тэксце? Раскажы, што ты ведаеш пра мядзведзя. Апішы яго.

**18.** Прачытай выразна радкі пра вясну. Вывучы на занятках верш на памяць. Раскажы заўтра сваім сябрам.

З горкі-горачкі, дзе грэчка,
ручаёк прыбег да рэчкі.
*Васіль Жуковіч*

**19.** Прачытай. Прыдумай загаловак да тэксту і запішы яго.

______________________________

Лясныя жыхары добра падрыхтаваліся да зімы. Ваўкі, лісіцы і зайчыкі апранулі цёплае зімовае адзенне. Яшчэ да маразоў пачынае будаваць жыллё мядзведзь. У глыбокіх норах зімуюць вожыкі і мышы.

- Размалюй аднаго са звяроў (на выбар). Апішы яго.






**20.** Злучы стрэлкамі беларускія словы з адпаведнымі рускімі словамі.

Запомні: ***краіна — страна, бусел — аист.***

| | |
|---|---|
| поле | страна |
| краіна | поле |
| бусел | путник |
| падарожнік | лес |
| Беларусь | аист |
| лес | Беларусь |

**21.** Прачытай словы. Складзі сказы (з двух слоў кожны), каб атрымалася апавяданне пра вясну. Запішы іх.

Сонца, трава, птушкі, зелянее, бягуць, прыпякае, ручайкі, прылятаюць.

**22.** Прачытай словы. Запішы іх ў алфавітным парадку.

Клас, дзеці, вавёрка, сям'я, луг, хмара, цяпло, святло, воўк, ліса.

• Раскажы пра сваю сям'ю (назаві імёны мамы, таты, брата (сястры), бабулі, дзядулі).

**23.** Прачытай. Пра каго расказваецца ў тэксце? Адкажы на пытанні. Запішы адказы. Што значыць багаты ўраджай?

У зайчыка быў агарод. Там ён вырошчваў капусту і моркву. Восенню зайчык сабраў багаты ўраджай. Прыйшлі да яго ў госці вавёрка і вожык. Зайчык частаваў і забаўляў гасцей. Усе добра павесяліліся.

Што вырошчваў зайчык? ______

Які ўраджай ён сабраў? ______

Хто прыйшоў да зайчыка ў госці? ______

Як зайчык прымаў гасцей? ______

**24.** Прачытай. Вывучы верш на памяць. Раскажы сваёй бабулі.



### Бабуліны казкі

У бабулі маёй рукі лоўкія,
у бабулі маёй песні доўгія.
Разматае клубок з новай казкаю,
прыйдзе хітры каток, трэцца з ласкаю.

*Вера Вярба*

- Разгледзь малюнак, апішы бабулю. Прыдумай і запішы ёй імя.

______________________________________________________________

**25.** Пастаў націск у словах. Выберы патрэбную літару ў дужках, падкрэслі яе.

Дз*(е/я)*цінства, м*(е/я)*док, в*(е/я)*снавы, в*(е/я)*селле, в*(е/я)*дзерца, ц*(е/я)*ц*(е/я)*рук, пес*(е/я)*нька, дз*(е/я)*цел, зв*(е/я)*рок, с*(е/я)*стрычка, з*(е/я)*л*(е/я)*ніна, пев*(е/я)*нь, ц*(е/я)*ц*(е/я)*рукі, п*(е/я)*юць, зел*(е/я)*нь.

**26.** Устаў у словы літару ***е*** ці ***я*** замест кропак.

Дз..дуля, в..с..ліцца, сн..гавік, м..дзведзь, чэрв..нь, вес..ла, н..дзеля, жнів..нь, сн..жынка, дз..ўчынка, в..ц..рок, у зел..ні, л..дз..ная, св..тло, сп..вакі, ц..нёк.

**27.** Прачытай. Запішы назвы месяцаў у алфавітным парадку. Назаві летнія, восеньскія, зімовыя месяцы.

Ліпень, жнівень, верасень, лістапад, кастрычнік, студзень, люты.

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

**28.** Прачытай. Пра што тэкст? Чаму кожны чалавек павінен берагчы сваю маці? Вывучы на памяць апошні сказ і раскажы маме.

Як прыемна, калі маці збірае ў дарогу або сустракае свайго вандроўніка. Дык давайце ж нізка паклонімся нашым дарагім матулям! Бо няма нічога і нікога даражэйшага за маці ва ўсім свеце (*Пятрусь Броўка*).

**29.** Прачытай тэкст.

Ішоў па гораду Слуцку магутны зубр. Было лета. У садах паспелі яблыкі, грушы, слівы. Зубр трос рагамі дрэвы. Ён частаваўся садавінай. Людзі дзівіліся. Міліцыя выправадзіла зубра з горада (*Васіль Вітка*).



- Па тэксце і малюнку адкажы на пытанні. Патрэбнае падкрэслі.

Які быў зубр? Вялікі, малы. Слабы, магутны.
Якая была пара года? Зіма, вясна, лета, восень.
Чым частаваўся зубр? Гароднінай, садавінай, варэннем.
Адкуль выправадзіла міліцыя зубра? З гораду, з лесу.
Дзе жыве зубр? У горадзе, у лесе.

**30.** Прачытай. Запішы словы ў алфавітным парадку. Пастаў у іх націск.

Крапіва, буракі, таварышы, маленькі, сябар, агуркі, яблыкі, парэчкі.

**31.** Прачытай тэкст.

Мой сябар жыве ў Мінску. Я вырашыў напісаць яму пісьмо. У ім я паведаміў сябру пра свае справы. У канцы перадаў прывітанне ад нашага агульнага сябра Колі. Пісьмо ўклаў у канверт, напісаў адрас і аднёс на пошту.

- Прачытай пісьмо хлопчыка. Напішы пісьмо свайму сябру па ўзоры.

*Добры дзень, дарагі Міша!*
*Як ты жывеш? Як справы? Чым займаешся? У мяне ўсё добра. Вучуся. Прывітанне табе ад Колі.*

______________________________

______________________________

______________________________

______________________________

______________________________

**32.** Прачытай верш.

Дзве сястрыцы А і Б
добра гралі на трубе.
Памагчы заўсёды рад
быў сястрыцам меншы брат.

*Васіль Вітка*

- Адкажы на пытанні:

Як звалі адну сястрыцу?
Як звалі другую сястрыцу?
Як звалі маленькага брата? Ён стаіць паміж сястрыцамі.

**33.** Імёны бываюць поўныя і скарочаныя. Да скарочаных імён падбяры поўныя і запішы іх.

Алёша, Жэня, Валік, Сцёпа, Саша, Света.

______________________________

